# «Генавы гены»: феномен творчасці Хацкевічаў

**_18 снежня ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» (Палац Рэспублікі) адкрылася выстаўка «Генавы гены» вядомага беларускага мастака Генадзя Хацкевіча (1952 – 2014), а таксама яго дзяцей Аляксея і Мадлен і ўнукаў Ганны і Пятра._**



*Г. Хацкевіч, «Пра каханне» (2005–2007 гг.)*

Аўтарам праекта выступіў сын мастака Аляксей, прысвяціўшы яго свайму знакамітаму бацьку – легендзе беларускага авангарда, аднаму з самых экстравагантных прадстаўнікоў выяўленчага мастацтва Беларусі, чыя творчасць ніколі не пакідае абыякавым.

Г. Хацкевіч скончыў Мінскае мастацкае вучылішча (цяпер Мінскі мастацкі каледж імя А.К. Глебава), Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў), дзе навучаўся на аддзяленні манументальна-дэкаратыўнага мастацтва ў выдатнага майстра Гаўрылы Вашчанкі.

Творчая біяграфія мастака пабудаваная на кантрастах навакольнага асяроддзя, робіць зігзагі і стромкія павароты на кожным кроку творцы. Усе гэтыя жыццёвыя перыпетыі адбіліся на яго палотнах з багатымі і разнастайнымі сюжэтамі. Сам Г. Хацкевіч меркаваў, што яго карціны заснаваныя на тэхналагічных і навуковых адкрыццях. Працы мастака знаходзяцца ў музеях, галерэях і прыватных зборах Беларусі, Расіі, Францыі, Германіі, Нідэрландаў, Вялікабрытаніі, ЗША.

На выстаўцы прадстаўленыя розныя перыяды творчасці мастака.

Свае творы таксама выставілі сын А. Хацкевіч (выпускнік Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, Школы мастацтваў Масана, што ў Барселоне, сябра Беларускага саюза мастакоў), дачка М. Хацкевіч (адзін з самых запатрабаваных дызайнераў адзення ў Парыжы), унукі Ганна і Пётр, якія ідуць па слядах сваіх унікальных сваякоў.

Куратар выстаўкі – мастацтвазнаўца, дацэнт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, сябра Беларускага саюза мастакоў, арт-дырэктар аўтарскай некамерцыйнай канцэптуальнай галерэі «Брама» Ларыса Фінкельштэйн.



*Л. Фінкельштэйн (злева) з мастаком А. Хацкевічам і яго дзецьмі*

*Павел САПОЦЬКА,*
*фота Кацярыны АЛЯКСЕЕВАЙ*